В. Варапаева

# Дзіцячай бібліятэцы № 1 – 55 год

Ёсць месцы на зямлі, блізкія і дарагія кожнаму чалавеку, – гэта бацькоўская хата, горад, вёска, у якіх нарадзіўся, вырас, сустрэў першае каханне. Туды заўсёды хочацца ісці, ехаць. Такой установай, дзе адпачываеш душой, набіраешся розуму і моцы, для многіх стала дзіцячая бібліятэка № 1 горада Мінска. Не выключэнне і я. Усе падручнікі (а іх больш за 20), па якіх вучацца дзеткі пачатковай і спецыяльнай школ, створаны ў сценах гэтай бібліятэкі. Чаму менавіта тут? Зручна, утульна, прыгожа, бібліятэкарыпрафесіяналы – амаль што ўсе мае вучні. І так прыемна, так хораша, калі бачыш, што тое зерне, якое калісьці было кінута ў БДУ культуры і мастацтваў, вырасла і ператварылася ў буйную збажыну. Гэта сапраўдны калектыў аднадумцаў, калектыў творцаў, калектыў неабыякавых людзей. Калектыў, які з любоўю і павагай ставіцца да сваіх чытачоў, – ІХ ВЯЛІКАСЦІ ДЗЯЦЕЙ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзіцячая бібліятэка № 1 – адна са старэйшых бібліятэк горада Мінска. У 2008 г. ёй – 55 год. На працягу ўсяго гэтага часу бібліятэка не змяніла свайго адраса – Гарадскі вал, дом №3. Бібліятэка з'яўляецца структурным падраздзяленнем Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк горада Мінска. У сваёй дзейнасці яна каардынуе працу са школамі, дашкольнымі ўстановамі, педагогамі – арганізатарамі навучальных устаноў, дзяржаўнымі, грамадскімі і сацыяльнымі арганізацыямі, беларускімі пісьменнікамі.

Уся праца бібліятэкі накіравана на інтэлектуальнае, грамадзянскае, эстэтычна-маральнае выхаванне і станаўленне асобы дзіцяці, арганізацыі доступу да інфармацыі, якая забяспечвае адукацыйныя патрэбы маладога пакалення.

Праца бібліятэкі камп'ютэрызавана, ёсць аўдыёі відэаапаратура. Адметнасцю бібліятэкі з'яўляецца багаты кніжны фонд, разнастайны па тэматыцы і жанрах, які можа задаволіць амаль любы чытацкі запыт.

Дзіцячая бібліятэка № 1 праводзіць шматаспектную культурна-асветніцкую работу, але на працягу многіх гадоў прыярытэтным напрамкам з'яўляецца краязнаўчы.

У бібліятэцы ёсць асобная зала беларускай літаратуры, у якой прадстаўлена мастацкая і навукова-папулярная літаратура.

У краязнаўчай зале аформлена маляўнічая выстава «Візітная картка Беларусі», якая расказвае пра шэсць абласцей нашай краіны, пра памятныя мясціны, пра культуру і гісторыю розных куточкаў Беларусі. Малодшым чытачам краязнаўчая зала адрасуе выставы: «Кнігі пазнаёмяць: з роднай мовай; з легендамі і казкамі; з прыродай; з гісторыяй; з беларускімі дзіцячымі часопісамі». Выстава «Старонкі календара» знаёміць са знамянальнымі датамі беларускай культуры і літаратуры.

Шмат увагі надае бібліятэка прапагандзе беларускай гісторыі, літаратуры і мастацтва. Гэты накірунак мае назву «Наша Беларусь». У русле яго працуе краязнаўча-гістарычны альманах «Спазнай Беларусь». Яго раздзелы:

- «Візітная картка Беларусі» – краязнаўча-турыстычная эстафета;
- «Бабулін куфэрак» – старонкі фальклорнага календара;
- «Гонар Беларусі» – мазаіка жыцця, падзей, імён краіны;
- «Дзівосы роднага краю» – цыкл экалагічных гадзін.

У рамках краязнаўчага кірунку дзейнічае літаратурна-мастацкая гасцёўня «На ростанях». Адказная за работу гасцёўні – Латош С.Б. Тэмамі яе пасяджэнняў з'яўляюцца: «Дзівасвет» – гадзіны беларускага мастацтва; «Музы і таленты» – галерэя партрэтаў дзеячаў беларускай культуры; «Прачытаў сам – раскажы сябрам!» – сустрэчы з новымі кнігамі, прэзентацыі новых імён.

Для малодшых школьнікаў створана фальклорна-этнаграфічная студыя «Купалінка».

Цікава і арыгінальна праходзяць пасяджэнні гэтай студыі, актыўныя ўдзельнікі яе – вучні малодшых класаў, народныя фальклорныя калектывы, этнографы, пісьменнікі. Кіраўніком студыі з'яўляецца Федарцова М.Д.

Асабліва запомнілася мерапрыемства пад назвай «Вяснулечка-краснулечка, мы цябе чакаем, мы цябе вітаем!» з удзелам вядомага беларускага этнографа і фалькларыста, прапагандыста народных танцаў, балетмайстра Міколы Котава і Рудзенскага народнага фальклорнага калектыву «Крынічанька».

М. Котаў цікава і даступна расказаў дзецям пра гісторыю беларускіх свят і абрадаў, пра побыт і жыццё нашых продкаў. Удзельнікі фальклорнага калектыву ў прыгожых нацыянальных касцюмах пазнаёмілі вучняў з песнямі беларускага народа. Жывое выкананне беларускіх абрадавых песень пакінула ў дзяцей незабыўнае ўражанне, а віртуознае гранне на драўляных лыжках, з якім выступіў М. Котаў, выклікала буру апладысментаў.

Штогод бібліятэка традыцыйна адзначае Свята беларускага пісьменства і друку. На працягу тыдня праходзяць мерапрыемствы пад агульнай назвай «Святло роднага слова».

Імкнучыся садзейнічаць адукацыі і самаадукацыі дзяцей і падлеткаў у галіне прафесійнага самавызначэння, бібліятэка распрацавала доўгатэрміновую праграму «Крок у прафесію», у рамках якой наладжаны сувязі з дзяржаўнымі ўстановамі.

Аформлена пастаянна дзеючая выстаўка «Крок у прафесію» з раздзеламі аб прафесіях, з інфармацыяй для абітурыентаў і г. д.

Для вучняў выпускных класаў арганізуюцца сустрэ чы з прадстаўнікамі сярэдніх спецыяльных навучаль ных устаноў г. Мінска, адбываюцца мультымедыйны прэзентацыі гэтых навучальных устаноў.

Створана база даных «Сярэднія спецыяльныя на вучальныя ўстановы г. Мінска».

У бібліятэку запрашаюцца цікавыя людзі, улюбёны ў сваю працу, якія прапагандуюць пэўныя прафесіі.

Перыядычна арганізуюцца «Дні інфармацыі» з за прашэннем спецыялістаў.

Для выяўлення псіхалагічных асаблівасцей, схіль насцей і здольнасцей падлеткаў у рамках кірунк «Крок у прафесію» бібліятэка праводзіць анкетаванне тэсціраванне, сустрэчы з псіхолагамі, урачамі.

Для малодшых школьнікаў праграма «Крок у пра фесію» прадугледжвае працу гасцёўні «Дванаццац месяцаў – дванаццаць прафесій», якую вядзе Якімчу Н.М., мультымедыйныя прэзентацыі «Прафесіі нашы мам, прафесіі нашых тат».

У сваёй працы бібліятэка не пакідае без уваі прапаганду здаровага ладу жыцця. Да Года здароў распрацаваны шэраг мерапрыемстваў для ўсіх узро ставых катэгорый. Для малодшых школьнікаў – лекто рый «Крынічка здароўя», для сярэдняга і старэйшаг ўзросту – цыкл інфармацыйных гадзін «Здаровы будзеш – усяго здабудзеш».

Садзейнічаючы эстэтычнаму выхаванню дзяцей падлеткаў, пашырэнню іх кругагляду і ведаў аб іншы краінах, бібліятэка наладзіла кантакты з прадстаўнікам міжнародных культурных цэнтраў. Сумесна з ім праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы. Асаблів цікава прайшло ў бібліятэцы мерапрыемства ў рамка «Дня Турцыі». Расказаць аб сваёй краіне, аб яе куль туры і гісторыі ў госці да дзяцей прыйшлі прадстаўні турэцкай адукацыйна-культурнай установы «Достлук (Дружба).

Гасцёўню бібліятэкі, дзе праходзіла сустрэча упрыгожвала турэцкая нацыянальная сімволіка, гу чала турэцкая народная музыка. Увазе дзяцей был прадстаўлена невялікая выстаўка прадметаў побыт турэцкага народа: посуд, упрыгожванні, элементы на цыянальнага касцюма. Дэманстраваліся маляўнічы відэаслайды знакамітых мясцін Турцыі. Турэцкія госі з задавальненнем адказвалі на шматлікія пытанні ўдзельнікаў сустрэчы.

На працягу многіх гадоў бібліятэка не пакідае бе увагі дзяцей сацыяльна неабароненых, а таксам інвалідаў. Праца з гэтай катэгорыяй чытачоў дапамага ім сацыяльна адаптавацца ў грамадстве, садзейніча іх рэабілітацыі і ўключэнню ў грамадскае жыццё.

Эфектыўная праца бібліятэкі па прапагандзе кні і далучэнню да чытання дзяцей і падлеткаў была немагчыма без добра падрыхтаванага, адукаванаг калектыву прафесіяналаў. Узначальвае яго Аўсянёв Таццяна Генадзьеўна.

*Матэрыялы падрыхтавала вядучы бібліятэка дзіцячай бібліятэкі № 1 Латош С.Е*

**Summary**

The materials are devoted to public libraries anniversary dates – the 75th anniversary of the Presidential Library of the Republic of Belarus, the 40th anniversary of Polotsl State Scientific Library, and the 55th anniversary of Minsl Children Library.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ